**Блажэвіч, Э.** І сніўся busліны клёкат / Э. Блажэвіч // Сцяг працы (Міёры). — 1998. — 24 лют. — С. 2.

## І СНІЎСЯ БУСЛІНЫ КЛЁКАТ



Усё радзей і радзей мы успамінаем пра воінаў-інтэрнацыяналістаў, якія ваявалі ў Афганістане. Хаця некалі раней так шчыра ўсхвалялі іх мужнасць і гераізм.

Лічу, што кожны, хто пабываў на той «чужой» вайне, выконваючы свой воінскі абавязак, усё ж заслугоўвае нашай увагі і павагі. У ліку іх быў і наш зямляк, тады вясковы хлопец Юрый Марціноўскі з вёскі Станулева. Было яму ўсяго 19 гадоў, калі ён упершыню пачуў звон варожых куль, пабачыў разрывы мін і снарадаў, смерць людзей. Усё гэта разам неспадзявана захлынула яго...

### Пад сонцам Арменіі

Даведаўшыся, што пасля прызыву Юра трапіў служыць у пагранічныя войскі ажно ў далёкую Арменію, маці Ядвіга Міхайлаўна вельмі хвалявалася. Яе трывожыла, што раней юнаку не даводзілася «гасцяваць» дзесьці далёка ад дому. А тут раптам іх раздзяліла такая адлегласць. Бацька Эдмунд Аляксандравіч таксама вельмі смуткаваў па малодшаму сыну, але выгляду не падаваў.

Юра ж па натуры быў вясёлы, просты ў зносінах з людзьмі, пакладзісты. Таму хутка прызвычаіўся да новага армейскага жыцця. Яшчэ калі вучыўся ў Міёрскай СШ № 1 у старэйшых класах, авалодаў спецыяльнасцю вадзіцеля аўтамашыны ў Маляўскім ВВК. Спатрэбіліся навыкі, атрыманыя пад час працы пасля заканчэння школы слесарам у райаграпрамтэхніцы. Прайшоўшы спецыяльную перападрыхтоўку, малады салдат сеў за руль ЗІЛа. Ён вельмі добра авалодаў тэхнікай і хутка быў лепшым сярод вадзіцеляў не толькі ў сваёй вайсковай часці, але і займаў прызавыя месцы ў спаборніцтвах па ваджэнню і абслугоўванню аўтамабіля ва ўсёй акрузе.

За высокія паказчыкі ў авалоданні пагранічным майстэрствам, асабістую ўзорнасць у службе па ахове дзяржаўнай граніцы, выдатныя паказчыкі ў баявой і палітычнай падрыхтоўцы Юра быў адзначаны дыпломам.

Цераз дзевяць месяцаў службы юнак прыехаў на пабыўку дадому. Дарэчы, менавіта ў гэты час ён неспадзявана пазнаёміўся і са сваёй будучай жонкай. Але дні водпуску праляцелі непрыкметна. І зноў доўгая дарога ў Арменію.

**На вайне як на вайне**

Аднаго з салдат іх роты накіроўвалі для працягу службы ў мотаманеўраную часць. Вайскоўцы ведалі, што адтуль – дарога ў Афганістан. Але затым па сямейных абставінах таму юнаку дазволілі застацца. Яго ж месца заняў Юра.

І хаця мой субяседнік прасіў не ўпамінаць гэты выпадак, але ён вельмі важны, і таму я палічыла патрэбным усё ж яго прыгадаць, бо ўспрыняў паведамленне аб накіраванні за мяжу юнак як сапраўдны салдат. Хлопец не шукаў матываў, прычын, каб нейкім чынам пазбегнуць дальняй «камандзіроўкі».

Аднак Юру ўсё ж пашчасціла. Трапіў ён у групу, якая не ўдзельнічала непасрэдна ў баявых аперацыях, а займалася разведкай.

Першае баявое хрышчэнне атрымаў хлопец у гарах яшчэ па дарозе да пункта прызначэння. Яны трапілі пад абстрэл душманаў, і машына з’ехала ў кювет. Маладым салдатам, якія ўпершыню адчулі такую сітуацыю, зразумела, было неяк не па сабе. Але бяда ўсіх іх тады мінавала.

Жылі яны на невялічкай базе. Усяго тут было адзінаццаць чалавек, з якіх чатыры – салдаты, а астатнія афіцэры. Днём было ціха, а вось ноччу пачынаўся абстрэл. Амаль заўсёды засыналі яны пад свіст куль і разрывы снарадаў. На адным пункце з Марціноўскім служылі такія ж маладыя салдаты Міхаіл Палявода з Мінска, Аляксандр Бахараў з Валгаградскай вобласці, Сяргей Саланенка з Краснадарскага краю. Сярод афіцэраў былі узбек, таджык, украінец, татарын, рускія. Узаемаадносіны ў невялічкім шматнацыянальным калектыве былі самыя братэрскія.

Аднойчы ноччу пад час абстрэлу ад асколка снарада на іх пункце ўзарвалася ёмістасць з газай. Ад выбуху Міхаіл Палявода, які знаходзіўся побач, атрымаў вялікія апёкі. Ноччу, рызыкуючы ўласным жыццём, салдаты, сярод якіх быў і Юра, адвезлі свайго таварыша ў ваенны шпіталь. Хлопец выздаравеў, але свой след тая вайна ў яго жыцці пакінула.

Увогуле, кожны выезд з пункта быў небяспечны, можна было трапіць пад абстрэл душманаў. Кожны тыдзень на машыне ездзілі вайскоўцы ў горад за 150 кіламетраў за прадуктамі харчавання. Выязджалі таксама на заданні з афіцэрамі. Пры гэтым машына ўкамплектоўвалася значнай колькасцю агнястрэльнай зброі.

– Калі б хоць адна нейкая варожая куля трапіла, напрыклад, у скрынку з гранатамі, што стаяла ля сядзення вадзіцеля, – смяецца цяпер Юра, – то ад выбуху мы б разам з машынай былі дзесьці высока ў небе.

Аднаго разу Юра з таварышам вязлі на машыне афіцэра свайго пункта на заданне. Пры гэтым суправаджаў іх танк, які рухаўся наперадзе. З-за пылу, што перашкаджаў дыхаць, забіваў вочы, салдаты хацелі абмінуць яго, але камандзір забараніў. Праехаўшы яшчэ дзесятак метраў, хлопцы пачулі моцны выбух. Танк падарваўся на міне. Аднак у браніраванай машыне пашкоджана была толькі гусеніца. Кажуць, салдаты на вайне памыляюцца толькі аднойчы. Канечна ж, лепш перасцерагчыся, чым рызыкаваць уласным жыццём.

З пункта кожны раз салдаты выязджалі на заданне ці за прадуктамі не менш чым утраіх.

На той вайне давялося Юру бачыць, як абыходзяцца душманы са сваімі ж афганцамі, лічачы іх здраднікамі. Быў ён сведкай і расстрэлу камандзіраў душманаў.

Там, у гарах, трэба было строга захоўваць армейскую дысцыпліну. Многія хлопцы загінулі толькі з-за абыякавасці, няўважлівасці, нікому не патрэбнай рызыкі. Бясспрэчна, не хапала многім вопыту, цярпення. Юра з шкадаваннем зазначае, што асобныя юнакі, трапіўшы ў Афганістан, не вытрымлівалі вялікай псіхічнай нагрузкі і заканчвалі жыццё самагубствам.

Зусім побач з ім на суседнім пункце служыў у танкавай роце хлопец з Лёзна Саша Бельчакоў. Заўсёды пры сустрэчы яны жартам спрачаліся з ім, хто раней вернецца дадому. Але ён загінуў пры выкананні баявога задання летам 1986 года.

**Там і сонца з паветрам іншыя**

Цікаўлюся, як адносілася мясцовае насельніцтва да савецкіх салдат.

– Увогуле добразычліва, – падкрэслівае Юра. – Сярод тутэйшага насельніцтва былі ў мяне два добра знаёмыя: дуканшчык (прадавец) невялічкага ўласнага магазіна Шамсуло і шафёр Халік, якія ветліва называлі мяне «рафік». У перакладзе гэта азначае таварыш.

Давялося юнаку нават трапіць да аднаго з іх у госці. Частаваў гаспадар чаем, хлебам. Дарэчы, апошні тут вельмі смачны. У пакоях прыгожыя дываны. Але не ўсе там жывуць так заможна. Вельмі часта даводзілася вайскоўцам сустракаць на вуліцах жабракоў.

Жывуць людзі ў глінабітных аднапавярховых дамах, унутры якіх для абагрэву змуравана на зямлі невялічкае паглыбленне ў форме ачага. Дроў там практычна няма. Замест паліва выкарыстоўваюцца сухія фекаліі жывёлы. Праўда, зрэдку даводзілася Юру бачыць, як прадавалі афганцы замест дроў, узважваючы бязменам, абчышчаныя ад кары тоненькія дубчыкі. Вельмі дзіўна было, што ніводзін гаспадар не вырошчвае побач з домам ніякай агародніны. Канечне ж, глебы тут зусім не ўрадлівыя, паўсюдна пяскі. Юра зазначае, што ў тых мясцінах зіма доўжыцца ўсяго некалькі тыдняў з невялічкім пахаладаннем. Зрэдку выпадае снег.

Ва ўсёй акрузе не было ніводнага калодзежа. Усе бяруць ваду з арыкаў (канавак), якія пракапаны з гор і напаўняюцца крынічнай вадой. Яна тут вельмі мутная, амаль карычневага колеру. Для салдат гэта было вельмі нязвыкла. Была таксама небяспека, што вада гэтая магла быць атручанай. Таму яны ездзілі для папаўнення яе запасаў за 45 кіламетраў у штучна створанае салдатамі з бетонных пліт вадасховішча.

Субяседнік з цікавасцю адзначае, што ў час праследвання душманы, здаралася, хаваліся ў мячэць. Там іх згодна рэлігійных законаў не меў ніхто права нават, як кажуць, пальцам зачапіць.

Усе жанчыны ў той мясцовасці ходзяць закрыўшы твары паранджой. У мужчын жа галовы пакрыты чалмой.

Вельмі прыгожае відовішча даводзілася назіраць салдатам, як пераліваліся рознымі адценнямі на сонцы высокія горы.

Але Юра і яго сябры пастаянна сумавалі па сваіх лясах і азёрах, роднай вёсцы, дзе было ўсё такім блізкім і звыклым. І ім там, на чужбіне, ужо не верылася, што пашчасціць зноў вярнуцца дадому.

**А дома яго чакалі**

родныя, бацькі. Маці Юры часта плакала і малілася... малілася. Яна штодзень адпраўляла яму пісьмы, а ў дадатак клала разам пусты канверт. Гэтак жа рабілі і іншыя бацькі салдат, бо ў Афганістане канвертаў у продажы не было. Гэтыя сардэчныя бацькоўскія лісты значна ўздымалі юнаку настрой.

Калі Юра паведаміў, што яго дэмабілізавалі, Ядвіга Міхайлаўна амаль два тыдні раніцай сустракала на вакзале поезд, на якім, па яе разуменню, павінен быў вярнуцца дадому сын. Той жа затрымліваўся. Затое прыехаў да бацькоў не адзін, а з сябрамі па афганскай службе. Пабываў у іх у гасцях і сам.

**Жыццёвыя будні**

З той пары мінула ўжо больш дзесяці год. Юра ажаніўся. У яго сям'і падрастае сын Валера.

Ільготамі былы «афганец» не карыстаецца, бо пасля распаду СССР яны скасаваны. І ўсё ж яму яшчэ тады пашчасціла атрымаць па льготнай чарзе ў райцэнтры двухпакаёвую кватэру.

З 1986 года Ю. Марціноўскі працуе вадзіцелем у раённым тэрытарыяльным медыцынскім аб'яднанні. Пяты год ён кіруе машынамі «хуткай» дапамогі. Шмат людскога гора давялося і тут пабачыць, бо кожны выклік «хуткай» – гэта чужы боль, часам смерць. Бываюць, праўда, і крыху больш радасныя моманты. Напрыклад, нядаўна ездзілі за парадзіхай па выкліку. Фельчар прывяла ў машыну не толькі жанчыну, але і прынесла нованароджанае дзіця. Роды яна прымала дома.

На машыне Юра працуе з напарнікам. Іх старэнькая «хуткая» заўсёды ў добрым тэхнічным стане, хаця прабег перавысіў 500 тысяч кіламетраў. Каб яна заўсёды была на ходу, нярэдка рамантавалі яны яе ў выхадныя дні. Цяпер атрымалі новую машыну. Затое часцей даводзіцца ездзіць у далёкія камандзіроўкі.

У выхадныя дні Юра дома бывае рэдка. То на ўласнай дачы працуе, то дапамагае бацькам, якія па-ранейшаму жывуць у вёсцы. Мае ён некаторыя цяслярскія навыкі, якія пераняў ад свайго бацькі. Гэта чалавек справы. А вось зімой вельмі любіць пасядзець на возеры з вудай.

І хаця ў размовах з сябрамі, дома ён усё радзей прыгадвае пра тыя далёкія афганскія дні, але ў памяці яны застануцца надоўга.

**Э. Блажэвіч**

*На здымку: Ю. Э. Марціноўскі*

*Фота К. Блажэвіча*